Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_________________ А. І. Жук
«___» ______________2012 г.
Рэгістрацыйны № ТД-____ / тып.

# БЕЛАРУСКІ ТАНЕЦ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела
навучальных устаноў і работы
з творчай моладдзю
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
_____________ А. А. Мукалаў
«___» _____________ 2012 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай
і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ С. І. Раманюк
«___» ________________ 2012 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб'яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
________________ Б. У. Святлоў
«___» ________________ 2012 г.

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай
рабоце дзяржаўнай установы
адукацыі «Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы»
_________________ В. І. Шупляк
«___»________________ 2012 г.

Эксперт-нормакантралёр
«____» ______________ 2012 г.

Мінск
БДУКМ
2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнікі:**

*С. В. Гуткоўская*, загадчык кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, прафесар;

*В. В. Шапавалава*, старшы выкладчык кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* тэорыі і методыкі выкладання мастацтваў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка»;

*У. Саркісьян*, прафесар кафедры майстэрства акцёра ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», дацэнт, народны артыст Рэспублікі Беларусь

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 18.01.2012 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 06.03.2012 г.);

навукова-метадычным саветам па харэаграфіі і мастацтве эстрады Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 4 ад 13.03.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказны за выпуск *С. В. Гуткоўская*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Беларускі танец» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках) (напрамкі спецыяльнасці 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец); 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец); 1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)).

У аснове праграмы ляжыць прынцып міжпрадметных сувязей з іншымі спецдысцыплінамі, такімі як «Гісторыя харэаграфіі і аналіз харэаграфічных твораў», «Класічны танец», «Народна-сцэнічны танец» і «Мастацтва балетмайстра».

*Мэтай* дысцыпліны з'яўляецца знаёмства з багаццем і разнастайнасцю народнай танцавальнай культуры Беларусі і беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі.

*Задачы* дысцыпліны – знаёмства з этапамі станаўлення і развіцця беларускай народнай танцавальнай творчасці і беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі; авалоданне асноўным лексічным фондам беларускага народнага танца і беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі; вывучэнне рэгіянальных асаблівасцей беларускага народнага танца; набыццё практычных навыкаў і ўменняў у выканальніцкай і педагагічнай дзейнасці.

У працэсе навучання фарміруюцца наступныя кампетэнцыі: акадэмічныя – навучэнец павінен валодаць базавымі ведамі ў галіне беларускага народнага танца і выкарыстоўваць іх у вырашэнні тэарэтычных і практычных задач; сацыяльна-асобасныя – валодаць здольнасцямі да сацыяльнага ўзаемадзеяння і міжасобасных камунікацый, умець працаваць у калектыве, быць здольным да крытыкі і самакрытыкі; прафесійныя – асвоіць асноўны лексічны фонд беларускага танца, авалодаць выканальніцкімі (выразнасць, артыстызм, тэхніка і манера выканання) і педагагічнымі (метадычнае тлумачэнне, практычны паказ рухаў, камбінацый і эцюдаў) уменнямі і навыкамі, асвоіць стыль і манеру выканання на прыкладзе лепшых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэнічных узораў беларускага народна-сцэнічнага танца, набыць веды па спецыфіцы выкладання беларускага народнага танца.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– прынцыпы класіфікацыі беларускага харэаграфічнага фальклору;

– асаблівасці і асноўныя выразныя сродкі розных жанраў беларускай народнай танцавальнай творчасці;

– рэгіянальныя асаблівасці беларускага народнага танца;

– методыку вывучэння лексікі беларускага народна-сцэнічнага танца;

– методыку пабудовы ўрокаў беларускага народна-сцэнічнага танца;

– прынцыпы музычнага суправаджэння ўрокаў беларускага танца;

– лепшыя ўзоры беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі ў пастаноўцы вядучых айчынных балетмайстраў;

*умець:*

– выконваць асноўныя рухі беларускага народна-сцэнічнага танца з захаваннем асаблівасцей выканальніцкай манеры;

– паслядоўна развучваць элементы лексікі беларускага народна-сцэнічнага танца ў адпаведнасці з правіламі музычнай раскладкі;

– праводзіць заняткі па беларускім танцы для розных узроставых катэгорый і ў калектывах рознай накіраванасці;

– творча пераасэнсоўваць традыцыйныя элементы беларускага народнага танца і ствараць новыя рухі, выкарыстоўваючы іх пры стварэнні камбінацый і эцюдаў;

– здзяйсняць тэхнічнае ўскладненне традыцыйных элементаў з захоўваннем іх самабытнай асновы;

– прымяняць веды па беларускім танцы ў выкладчыцкай дзейнасці.

Метадычнай асновай і эфектыўнымі тэхналогіямі навучання па дысцыпліне з'яўляюцца дзейны падыход як аснова навучання, метад аналізу, метад рэйтынгавай ацэнкі вучэбных дасягненняў, камунікатыўныя тэхналогіі, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі вопыту вырашэння задач у іх будучай прафесійнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На лекцыйных занятках студэнты атрымліваюць веды па гісторыі ўзнікнення і бытавання беларускага народнага танца, вывучаюць яго рэгіянальныя асаблівасці, а таксама сучаснае становішча і асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі.

На практычных занятках студэнты авалодваюць выканальніцкімі (знаёмства з вобразнай сістэмай і засваенне асноўных выразных сродкаў беларускага танца) і педагагічнымі (метадычнае тлумачэнне, практычны паказ рухаў, камбінацый і эцюдаў) уменнямі і навыкамі, асвойваюць стылістыку выканання беларускага танца на прыкладзе лепшых сцэнічных узораў.

На індывідуальных занятках студэнты асвойваюць спосабы і прыёмы сачынення камбінацый і эцюдаў на аснове традыцыйных элементаў беларускага народнага танца.

Значная роля ў вывучэнні дысцыпліны адводзіцца самастойнай рабоце студэнтаў, якая накіравана на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці, на ўдасканаленне прафесійных кампетэнцый. Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае вывучэнне вопыту работы вядомых айчынных харэографаў і знаёмства з рэпертуарам прафесійных і аматарскіх калектываў Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Беларускі танец» усяго адведзена 330 гадзін, з якіх 174 гадзіны – аўдыторныя заняткі (10 г. – лекцыі, 148 г. – практычныя заняткі, 16 г. – індывідуальныя заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ./лаб. | інд. зан. |
| ***Уводзіны*** | 1 | 1 | | |
| ***Тэма 1.*** Беларускі харэаграфічны фальклор | 15 | 1 | 12 | 2 |
| ***Тэма 2.*** Асноўныя выразныя сродкі беларускага танца | 31 | 1 | 28 | 2 |
| ***Тэма 3.*** Рэгіянальныя асаблівасці беларускага танца | 27 | 1 | 24 | 2 |
| ***Тэма 4.*** Станаўленне і развіццё беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі | 1 | 1 | | |
| ***Тэма 5.*** Лексіка беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі і методыка яе вывучэння | 31 | 1 | 28 | 2 |
| ***Тэма 6.*** Музыка беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі | 13 | 1 | 10 | 2 |
| ***Тэма 7.*** Методыка пабудовы ўрока беларускага народна-сцэнічнага танца | 23 | 1 | 20 | 2 |
| ***Тэма 8.*** Сучаснае становішча беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі | 5 | 1 | 4 | |
| ***Тэма 9.*** Узоры беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі | 27 | 1 | 22 | 4 |
| **Разам …** | **174** | **10** | **148** | **16** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта і задачы дысцыпліны «Беларускі танец». Роля і значэнне дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыяліста-харэографа. Патрабаванні да студэнтаў пры вывучэнні дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

## Тэма 1. Беларускі харэаграфічны фальклор

Беларуская народная танцавальная творчасць і яе характарыстыка. Харэаграфічны фальклор у працах Ю. Чурко і іншых даследчыкаў танцавальнай спадчыны беларускага народа. Структурна-стылістычны метад класіфікацыі беларускага харэаграфічнага фальклору. Асноўныя танцавальныя жанры і іх характарыстыка.

## Тэма 2. Асноўныя выразныя сродкі беларускага танца

Пазіцыі рук і ног у беларускім народным танцы. Найбольш распаўсюджаныя палажэнні рук у сольным, парным і масавым танцах. Асноўныя танцавальныя крокі, хады, рухі і кампазіцыйныя пабудовы беларускіх карагодаў, традыцыйных танцаў, полек, кадрыляў і гарадскіх бытавых танцаў. Адлюстраванне сродкамі лексікі характару, вобразнага зместу і нацыянальнага каларыту танцавальнага твора. Узоры беларускай народнай танцавальнай творчасці розных жанраў.

## Тэма 3. Рэгіянальныя асаблівасці беларускага танца

Гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне тэрыторыі Беларусі і характарыстыка тэрытарыяльна-этнаграфічных рэгіёнаў.

Рэгіянальныя асаблівасці беларускага народнага танца. Тэматыка, стылістычна-структурныя асаблівасці, нацыянальны каларыт, асноўныя танцавальныя рухі і малюнкі, характэрныя для народных танцаў розных рэгіёнаў Беларусі. Узаемадзеянне традыцыйнай беларускай харэаграфіі з танцавальнай культурай іншых народаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Станаўленне і развіццё беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі

Дзейнасць «Беларускай трупы» пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага па папулярызацыі са сцэны беларускіх народных танцаў. Формы іх сцэнічнай інтэрпрэтацыі. Узнікненне самадзейных харэаграфічных гурткоў у Беларусі ў паслярэвалюцыйныя гады. Нацыянальны танцавальны фальклор у спектаклях і канцэртах БДТ-1 (1920–1933).

Далейшае развіццё беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі. Сцэнічнае ўвасабленне фальклорных узораў у творчай дзейнасці прафесійных і аматарскіх харэаграфічных калектываў.

## Тэма 5. Лексіка беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі і методыка яе вывучэння

Традыцыйны лексічны фонд беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі, яго пасіўны і актыўны запас. Характарыстыка асноўных лексічных груп беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі. Методыка вывучэння лексічных элементаў і ўдасканаленне тэхнікі выканання. Асаблівасці выканальніцкай манеры ў беларускім танцы.

Творчае пераасэнсаванне традыцыйных элементаў і стварэнне новых танцавальных рухаў.

## Тэма 6. Музыка беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі

Агульная характарыстыка беларускай народнай танцавальнай музыкі. Роля і значэнне музычнага суправаджэння ў выкладанні беларускага танца. Структурнае і метрарытмічнае спалучэнне музычнай асновы і танцавальнай лексікі. Арганізуючая роля і эмацыянальнае ўздзеянне музычнага суправаджэння. Значэнне зместу музычнага твора, яго нацыянальнай своеасаблівасці, меладычных і рытмічных асаблівасцей і дынамічных адценняў у засваенні лексікі беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 7. Методыка пабудовы ўрока беларускага народна-сцэнічнага танца

Прынцып пабудовы і вядзення ўрока па вывучэнні лексікі беларускага народна-сцэнічнага танца. Асноўныя часткі ўрока і іх суразмернасць.

Паслядоўнасць развучвання элементаў танцавальнай лексікі ў адпаведнасці з правіламі іх музычнай раскладкі, характэрнымі асаблівасцямі выканання. Чаргаванне рухаў па складанасці і характары іх выканання.

Рытм і тэмп урока, раўнамернае размеркаванне фізічнай нагрузкі на суставы, звязкі і мышцы.

### Тэма 8. Сучаснае становішча беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі

Характарыстыка сучаснага становішча, асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі. Стварэнне сучасных твораў беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі. Знаёмства з рэпертуарам і аналіз творчай дзейнасці вядучых прафесійных і аматарскіх калектываў Рэспублікі Беларусь. Узаемасувязь і ўзаемаўплыў прафесійнага і аматарскага мастацтва ў галіне беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі.

Конкурсы, фестывалі – важны стымул для далейшага развіцця беларускага народна-сцэнічнага танца.

### Тэма 9. Узоры беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі

Пастаноўка сцэнічных узораў (фрагментаў) беларускага народнага танца розных жанраў у пастаноўцы знакамітых балетмайстраў. Вывучэнне лепшых узораў беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі, знаёмства з рэпертуарам вядучых айчынных прафесійных і аматарскіх калектываў.

Прынцыпы практычнага ўвасаблення сцэнічных узораў, прывіццё практычных навыкаў па методыцы іх развучвання. Работа над тэхнікай, выразнасцю і манерай выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Алексютович, Л. К.* Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Л. К. Алексютович. – Минск : Выш., шк., 1978. – 528 с.

2. *Беларускія* народныя танцы, карагоды, гульні / склад. і адк. за выпуск В. С. Семенякоў; навук. рэд. Ю. М. Чурко. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 137 с.

3. *Гребенщиков, С. М.* Белорусские танцы / С. М. Гребенщиков. – Минск : Наука и техника, 1978. – 240 с.

4. *Гребенщиков, С. М.* Сценические белорусские танцы / С. М. Гребенщиков. – Минск : Наука и техника, 1974. – 328 с.

5. *Гуткоўская, С. В.* Гарадскія бытавыя танцы / С. В. Гуткоўская. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – 140 с.

6. *Козенка, М. А.* Лексіка беларускага народна-сцэнічнага танца (частка 1) / М. А. Козенка. – Мінск : Полымя, 1993. – 112 с.

7. *Чурко, Ю. М.* Белорусский народный танец / Ю. М. Чурко. – Минск : Наука и техника, 1972. – 196 с.

8. *Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко. – Минск : Выш., шк. 1990. – 415 с.

*Дадатковая*

1. *Гребенщиков, С. М.* Белорусские танцы / С. М. Гребенщиков. – Минск : Наука и техника, 1964. – 330 с.

2. *Гребенщиков, С. М.* Ланская кадриль / С. М. Гребенщиков. – Минск : Наука и техника, 1964. – 280 с.

3. *Гребенщиков, С. М.* Белорусские танцы / С. М. Гребенщиков. – Минск : Наука и техника, 1966. – 248 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Гребенщиков, С. М.* Сценические белорусские танцы / С. М. Гребенщиков. – Минск : Наука и техника, 1969. – 290 с.

5. *Елатов, В. И.* Ладовые основы белорусской музыки / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1964. – 214 с.

6. *Елатов, В. И.* Мелодические основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1970. – 143 с.

7. *Скорабагатчанка, А. В.* Беларускія народныя музычныя інструменты XX стагоддзя / А. В. Скорабагатчанка. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 398 с.

8. *Хворост, И. М.* Белорусские танцы / И. М. Хворост. – Минск : Беларусь, 1977. – 370 с.

9. *Чурко, Ю. М.* Вянок беларускіх танцаў / Ю. М. Чурко. – Мінск : Беларусь, 1994. – 88 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў распрацаваны з улікам шматгадовай практыкі правядзення залікова-экзаменацыйных сесій па агульна-прафесійных і спецыяльных вучэбных дысцыплінах.

**10 балаў** (цудоўна) – ставіцца ў выключных выпадках, калі студэнт дэманструе высокі ўзровень ведаў па гісторыі і тэорыі беларускай народнай і народна-сцэнічнай харэаграфіі, рэгіянальных асаблівасцях беларускага танца, сучасным становішчы і асноўных тэндэнцыях развіцця беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі; на высокім прафесійным узроўні выконвае лексіку розных жанраў беларускага народнага танца і дасканала валодае методыкай яе вывучэння; ведае прынцыпы музычнага суправаджэння ўрокаў беларускага танца; граматна выкарыстоўвае спецыяльную тэрміналогію; валодае навыкамі работы з метадычнай літаратурай і пастаянна ёй карыстаецца; выконвае заданні для самастойнай работы ў поўным аб’ёме; зацікаўлены ў дасягненні высокіх мастацкіх вынікаў.

**9 балаў** (выдатна) – ставіцца, калі студэнт дэманструе высокі ўзровень ведаў па гісторыі ўзнікнення і бытавання беларускага народнага танца, яго рэгіянальных асаблівасцях; дэманструе прафесійны ўзровень выканання лексікі розных жанраў беларускага танца і валодае методыкай яе вывучэння; граматна выкарыстоўвае спецыяльную тэрміналогію; добра ведае метадычную літаратуру і ўмее працаваць з ёй; выконвае заданні для самастойнай работы ў поўным аб’ёме; праяўляе творчую ініцыятыву ў працэсе вывучэння дысцыпліны.

**8 балаў** (амаль выдатна) – ставіцца, калі студэнт дэманструе добры ўзровень ведаў па гісторыі і тэорыі беларускай народнай танцавальнай творчасці і сцэнічнай харэаграфіі; дэманструе высокі ўзровень выканання лексікі беларускага танца і выдатна валодае методыкай яе вывучэння; выкарыстоўвае спецыяльную тэрміналогію; ведае метадычную літаратуру і ўмее працаваць з ёй; выконвае заданні для самастойнай работы ў поўным аб’ёме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**7 балаў** (вельмі добра) – ставіцца, калі студэнт дэманструе добры ўзровень ведаў па гісторыі і тэорыі беларускай народнай танцавальнай творчасці і сцэнічнай харэаграфіі; добра валодае навыкамі выканання лексікі беларускага танца, але мае праблемы ў перадачы манеры выканання рухаў розных танцавальных жанраў і не ў дастатковай меры валодае методыкай іх вывучэння; ведае і выкарыстоўвае спецыяльную тэрміналогію; умее працаваць з метадычнай літаратурай, выконвае заданні для самастойнай работы.

**6 балаў** (добра) – ставіцца, калі студэнт дэманструе сярэдні ўзровень ведаў па гісторыі і тэорыі беларускай народнай танцавальнай творчасці і сцэнічнай харэаграфіі; валодае на дастатковым узроўні навыкамі выканання танцавальных рухаў, але мае праблемы з выкананнем тэхнічна складаных танцавальных элементаў; умее працаваць з метадычнай літаратурай, але няўпэўнена выкарыстоўвае спецыяльную тэрміналогію; заданні для самастойнай работы выконвае не ў поўным аб'ёме.

**5 балаў** (амаль добра) – ставіцца, калі студэнт дэманструе пасрэдны ўзровень ведаў па гісторыі і тэорыі беларускай народнай танцавальнай творчасці і сцэнічнай харэаграфіі; навыкі выканання танцавальных рухаў сфарміраваны ў недастатковай ступені; мае праблемы з выкананнем тэхнічна складаных танцавальных элементаў і пры дэманстрацыі манеры выканання лексікі розных танцавальных жанраў; метадычную літаратуру ведае ў недастатковым аб'ёме; дапускае памылкі пры выкарыстанні спецыяльнай тэрміналогіі; заданні для самастойнай работы выконвае нерэгулярна.

**4 балы** (цалкам здавальняюча) – ставіцца, калі студэнт дэманструе нізкі ўзровень ведаў па гісторыі і тэорыі беларускай танцавальнай творчасці і сцэнічнай харэаграфіі, слаба валодае практычнымі навыкамі і методыкай выканання танцавальнай лексікі; дрэнна ведае асноўную метадычную літаратуру і дапускае памылкі пры выкарыстанні спецыяльнай тэрміналогіі; заданні для самастойнай работы выконвае нерэгулярна і не ў поўным аб'ёме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3 балы** (здавальняюча) – ставіцца, калі студэнт дэманструе вельмі нізкі ўзровень ведаў па гісторыі і тэорыі беларускай народнай танцавальнай творчасці і сцэнічнай харэаграфіі; дрэнна валодае навыкамі выканання і методыкай вывучэння рухаў беларускага танца; слаба ведае метадычную літаратуру, абмежавана выкарыстоўвае спецыяльную тэрміналогію; не выконвае заданні для самастойнай работы.

**2–1 бал** (нездавальняюча) – выстаўляецца, калі ў студэнта амаль цалкам адсутнічаюць веды па гісторыі і тэорыі беларускай народнай танцавальнай творчасці і сцэнічнай харэаграфіі; дэманструецца нізкі ўзровень выканання танцавальнай лексікі і не асвоена методыка яе вывучэння; не выконваюцца заданні для самастойнай работы.

**Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

Для кантролю за засваеннем студэнтамі вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

– метады вуснай дыягностыкі ведаў (вуснае апытанне, дыскусіі, залік, экзамен);

– метады практычнай дыягностыкі (практычныя паказы, састаўленне і правядзенне ўрока па дысцыпліне).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БЕЛАРУСКІ ТАНЕЦ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для ўстаноў вышэйшай адукацыі*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. . Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.